лася, што дзяцінства не мае самастойнага значэння. Напачатку дзяцінства наогул не ўспрымалася як асобы феномен. Вядома, што ў мастацтве доўгі час дзеці паказваліся проста як маленькія дарослыя. Пазней, аднак, гарадская культура звярнула ўвагу на тое, што гэта свой свет і яго таксама неабходна арганізоўваць: узнікла цэлая галіна дзіцячай культуры — індустрыя цацак, кніг, спектакляў, кіно, тэлеперадач, музыкі для дзяцей. Аднак адносіны да гэтага свету заставаліся паблажлівымі.

Сёння, калі грамадствы імкліва пераходзяць ад традыцыйных да дынамічных, мяняюцца і адносіны паміж светам дарослых і дзяцей. Калі раней дзеці цалкам пераймалі традыцыі, нормы, законы і культуру свету дарослых, сёння, ва ўмовах імклівых змен, дзеці вучацца адзін у аднаго, у сітуацыі і часам гатовыя падзяліцца сваім вопытам са светам дарослых. Погляд дзіцяці — гэта погляд чалавека, для якога не існуе навязанай рэальнасці.

Як зрабіць так, каб утрымаць гэты бясцэнны дар непасрэднасці ў адносінах, стварыць прастору, у якой дзеці маглі б самі, без павучальнага ўмяшання дарослых свабодна кантактаваць і выражаць, што яны сапраўды любяць, што ненавідзяць, што сапраўды каштоўнае для іх? Пакуль яны самі гэтага не выразаць, яны не стануць сапраўды свядомымі, сапраўды грамадзянамі, сапраўды адукаванымі людзьмі.

Як казаў І. Кант, асвета — гэта выхад чалавека са стану "непаўналецця". Непаўналецце ёсць няздольнасць карыстацца сваім розумам без кіраўніцтва з боку каго-небудзь іншага. Яго прычына заключаецца не ў недахопе розуму, а ў недахопе рашучасці і мужнасці карыстацца ім без кіраўніцтва з боку каго-небудзь іншага. "Sapere aude! — май мужнасць карыстацца ўласным розумам! — такі, — піша І. Кант, — дэвіз Асветы". (Цыт. па: Конгеннальность мысли. О философе Мирабе Мамардашвили. М., 1994, с. 186.)

У новай рубрыцы, якая адкрываецца ў гэтым нумары часопіса, мы маем намер абмяркоўваць свет дзяцінства сучаснага дзіцяці. Як захаваць яго ў існуючых умовах? Якія змены адбываюцца ў гэтым свеце сёння? Якія падзеі сапраўды хвалююць сучасных дзяцей? Як зрабіць так, каб мы сваім дзеяннем, учынкам, выхаваннем не нанеслі шкоду асобе, якая нараджаецца сёння? Якім чынам чалавек будуе сябе як суб'екта? Мы перакананы, што ад таго, якім чынам чалавек адносіцца да сябе сёння, у рашучай ступені залежыць, якое грамадства мы будзем мець заўтра. Усе, хто бачыць, хто нераўнадушны да свету дзіцячых радасцей, слёз, пакут, пішыце нам.

# Прынцыповая беспрынцыповасць

Мы марудна, з цяжкасцю развітваемся з мінулым. Традыцыя вядзе нас, кіруе нашым мысленнем і ўчынкамі, умела хаваецца ў новыя адзежы са слоўных формул, ківае пальцам з начальніцкіх вышынь і абступае з усіх бакоў густым частаколам грамадскай думкі. Як вырвацца з палону забабонаў-стэрэатыпаў? Дзе знайсці надзейныя арыенціры ў нашых абсалютна непрадказальных сітуацыях? Сумненне і апярэджвае дзеянне, і ідзе непасрэдна за ім.

Сярод мноства прынцыпаў, што дасталіся нам у спадчыну ад савецкай педагогікі, ёсць адзін, правільнасць якога доўгі час мне здавалася несумненнай, — прынцып навуковасці. Яго карэлятам на мэтавым узроўні выступае задача фарміравання навуковага светапогляду ў падрастаючага пакалення. Ці можам мы сёння прымаць гэтыя ўстаноўкі, арганізуючы сваю педагагічную практыку? А калі можам, то які сэнс павінны ўкладваць у паняцці "навука" і "навуковы

светапогляд"? Мой нядаўні педагагічны і псіхалагічны вопыт сур'ёзна падарваў давер да гэтых пастулатаў.

Аднак аб усім па парадку.

Давайце перанясёмся ў думках у дзіцячы аздараўленчы лагер, які яшчэ зусім нядаўна быў піянерскім, а сёння — незразумела які. І вось у гэтым самым звычайным лагеры я, воляю лёсу, — псіхолаг з нявызначанымі, а значыць і незлічонымі функцыямі. Роўны, лянівы ход сытага лагернага жыцця з усёй належнай атрыбутыкай: цягамоцінай ранішніх зарадак, абавязалаўкай масавых мерапрыемстваў, бурным начным важацкім жыццём. Аднак самае сумнае — дзеці. Сваім знешнім выглядам яны нагадваюць пенсіянераў з бліжэйшага дома адпачынку. На пытанне аб тым, як ім тут жывецца, малышы паважна адказваюць, што лагер добры, харчаванне разнастайнае, пакоі ўтульныя, а вось дыскатэкі па вечарах маглі б быць і больш працяглымі.

І вось у гэтае балотнаглеістае жыццё раптам урываецца здарэнне, якое літаральна перавярнула ўсё з ног на галаву. У лагеры аб'явілася нячыстая сіла. А пачыналася ўсё так.

На адной з вячэрніх планёрак (педсаветаў) старшы выхавальнік зрабіў заўвагу студэнтцы-практыкантцы. Тая абурылася, адштурхнула фізрука, што выпадкова апынуўся ў яе на дарозе, і пабегла прэч з лагера, які ўжо засынаў.

Такая падзея, як вы разумееце, не магла прайсці бясследна. На наступны дзень па лагеры разнеслася чутка аб тым, што за Антуанетай Пятроўнай (назавём яе так) гнаўся чорт. Падрабязныя роспыты пацярпеўшай, праведзеныя ўстрывожанымі дзецьмі, выказаную гіпотэзу пацвердзілі. Антуанета апісвала чорта шматразова і ярка. Яго аблічча ўвесь час дапаўнялася новымі і новымі рысамі, пакуль не аформілася ў нейкі сімбіёз кацяняці з парасём.

Між тым падзея працягвала развівацца ўжо па сваіх уласных законах. Вось чутка ледзь тлее, і здаецца, што хутка зусім згасне. Але ў самы апошні момант раптам успыхвае з сілай і энергіяй выбуху, і ўжо ўвесь лагер толькі ёю і жыве, толькі пра яе і гаворыць, толькі праз яе разумее і ацэньвае тое, што адбываецца. У лагеры — пандэмія страху.

За адну ноч усе вокны, столі, сцены, дзверы, словам, усе плоскасці былі размаляваны крыжамі, нейкімі спецыяльнымі акружнасцямі і ромбамі, заклíканымі абараніць нашых выхаванцаў ад усюдыіснай ваяўнічай нячыстай сілы. Важатыя ў разгубленасці. Дзеці ходзяць толькі групамі, спяць у ложках па двое і па трое, дзверы на ноч барыкадуюцца. Ва ўсім, што іх акружае, малышы бачаць небяспеку або падвох. Што б вы сталі рабіць у гэтым выпадку, паважаны чытач? Вы б, напэўна, знайшлі разумнае выйсце, асабліва калі не вывучалі педагогіку ў нашых ВНУ і вучылішчах. З намі ж усё больш складана. Мы траўміраваныя навуковай педагогікай з усімі яе методыкамі і парадамі. Мы перакананыя ў тым, што нячыстай сілы няма на свеце, што гэта бабуліны забабоны, што трэба растлумачыць гэтым неразумным дзецям, як правільна (!) разумець тое, што адбылося.

У першым жа пакоі, які трапіўся мне па дарозе, я бітую гадзіну тлумачыў малышам паходжанне слядоў на стале і за шафай. Мае словы аб тым, што гэта ніякі не чорт, а халтурная работа маляроў і тынкоўшчыкаў, дрэнна прасеяная крэйда, пэндзлі, з якіх выпадае шчацінне, на дзяцей не дзейнічалі. Мне ў адказ прыводзіліся ўсё новыя і новыя сведчанні і аргументы. І чым больш упартым быў я, тым больш безнадзейным рабілася маё становішча. Ды і ў маіх калег адбывалася тое ж самае. Навуковы светапогляд відавочна цярпеў паражэнне ў сутыкненні з шалёнай энергіяй прымхаў.

Вось ужо дамоў у гарады і вёскі ляцяць тэлеграмы ад напалоханай дзятвы, вось збянтэжаныя ўрачы глынаюць жменямі заспакаяльныя таблеткі, а начальнік лагера праводзіць дзесятую за дзень нараду, заклікаючы педагогаў што-небудзь зрабіць. Упершыню за ўсю змену на тварах выхавальнікаў з'явілася разгубленасць.

Ноч толькі павялічыла нашы цяжкасці. Чорт лез у вокны, стукаў у дзверы, скрэбся пад бетоннымі перакрыццямі падлогі, вухкаў у лесе. Педсавет адмяніў выхадныя, размеркаваў усіх работнікаў лагера па дзіцячых пакоях. Ноч мы пратрымаліся.

А на наступны дзень адбылося вось што... Аднак спачатку я раскрыю вам нашу задуму адносна гэтага дня. Ён павінен быў стаць эксперыментальным. Замест звыклага пераліку дружынных мерапрыемстваў і атрадных спраў выхаванцам прапаноўваўся цэлы каскад ініцыятыў, з якімі выступалі атрадныя важатыя і ўсе жадаючыя. Любы педагог мог праверыць сябе ў справе — ці пойдуць добраахвотна да яго дзеці. Было абсалютна незразумела, ці захаваецца ўстойлівая структура атрадаў перад прывабнасцю і разнастайнасцю

ініцыятыў. І як доўга праіснуюць народжаныя ў гэты дзень справы-падзеі? Што з пераліку спраў будзе больш прыцягальным для выхаванцаў і якім акажацца ўзроставы роскід? Вось тыя нямногія пытанні, якія цікавілі нас як арганізатараў эксперыменту і на якія меркавалася атрымаць адказы ў ходзе яго.

Разам з тым цікава было вызначыць гатоўнасць дзяцей да выбару і незададзенасці. Мы меркавалі, што ім будзе няпроста зарыентавацца ў калейдаскопе спраў і падзей, але вопыт такой дзейнасці ў выхаванцаў уяўляўся нам педагагічна каштоўным і выступаў у якасці прыярытэтнай мэты.

Як і многія мае калегі, я ламаў галаву над тым, што мне прапанаваць дзецям. Свядомасць паслужліва падсоўвала стандартныя рашэнні: трэнінгавыя групы (зносіны — адносіны), дыскусійны клуб, публічная лекцыя... Не, усё не тое. У самога ад суму пры думцы аб гэтым сківіцы зводзіць. Ды і сітуацыя ў лагеры...

І раптам з'явілася нейкае пакуль яшчэ неакрэсленае рашэнне — "страшылкі"! Не, не тое. Клуб тых, хто хоча баяцца разам! Не, нешта не задавальняе. Вось, здаецца, гэта — "паляўнічыя за прывідамі"! Чым часцей я прагаворваў сабе гэту прывычную дзецям, навеяную імпартным тэлеэкранам назву, тым больш упэўніваўся ў правільнасці свайго выбару.

Значыць, так. Да мяне прыдуць дзеці з рознымі фабіямі і проста дапытлівыя. Гэта па-першае. Усім удзельнікам адразу задаецца актыўная пазіцыя — змагара з нячыстай сілай. Гэта па-другое. Узнікае эфект канструктыўнай добраахвотнай кансалідацыі самых розных па ўзросту і па інтарэсах дзяцей. Гэта па-трэцяе. Здаецца, для пачатку нямала. Што ж у астачы? Можна асцерагацца празмернага наплыву дзяцей, але тут павінны прыйсці на дапамогу астатнія важатыя са сваімі ініцыятывамі і адцягнуць частку дзяцей іншымі цікавымі справамі. Але самае страшнае не тое, што яны прыдуць, а тое, што з імі рабіць. Усё прыдуманае мной у кароткую летнюю ноч перад дэманстрацыяй ініцыятыў зводзілася да простай формулы: "Няхай выгаварацца". Вось з гэтым, мякка кажучы, невялікім запасам я і выходзіў на сцэну актавай залы, гаворачы такія словы:

— Я, дзеці, вучоны. У чарцей і цуды не верыў і не веру. Ва ўсякім разе, да сённяшняга дня. Але вось як жа быць з гэтымі доказамі?

Раптам падае стул і мае паперы, што ляжалі на ім, разлятаюцца па ўсёй сцэне. Зала ў разгубленасці, але першыя зоркія рады заўважылі вяроўку на ножцы стула і ўжо крычаць:

— Падман, вяроўка!

— Так, — ківаю галавою я, ратуючы свой аўтарытэт. — Вяроўка, вядома, была. Аднак хто яе прывязаў да ножкі стула? Хто пацягнуў? Не я ж?

Зала згаджаецца са мной, тым больш што зламыснік пасланымі за заслону добраахвотнікамі не знойдзены. Я дастаю з тоўстай папкі новыя пацвярджэнні наяўнасці нячыстай сілы: разрэзаныя шнуркі, перакрэсленыя старонкі рукапісаў, перапэцканыя клеем газеты.

— Цярпець і далей такія здзекі я не збіраюся і аб'яўляю вайну нячыстай сіле. Хто са мной?

Праз гадзіну ва ўказаным месцы я ў чарговы раз за гэтыя некалькі дзён пакутаваў ад разгубленасці і бяссілля. Каля сотні "паляўнічых за прывідамі" ад сямі да дванаццаці гадоў, перабіваючы і адштурхоўваючы адзін аднаго, прыводзілі ўсё новыя і новыя факты, якія пацвярджалі прысутнасць нячыстай сілы ў лагеры. Мае спробы неяк упарадкаваць абмеркаванне з трэскам праваліваліся. Кола "паляўнічых" увесь час развальвалася, гаварылі з двух бакоў адначасова, хапалі мяне за рукавы, наступалі на ногі. Мне расказвалі крыўды і сны, апісвалі падзеі ў лагеры і ў вёсцы ў бабулі, пераказвалі мультфільмы і сямейныя паданні. Паверце, гэта трэба было перажыць. А калі яшчэ ўлічыць, што частка дзяцей рвалася тут жа расквітацца з нячыстай сілай і гэтая частка ўвесь час тузала і перабівала тую, якая расказвала, то мой адчай стане вам цалкам зразумелы.

На жаль, у той час я яшчэ не чытаў нарысаў Л. М. Талстога аб Яснапалянскай школе і абсалютызаваў сваё становішча. Талстой, які таксама працаваў з дзіцячай стыхіяй, ведаў з вопыту, што першы ўсплеск актыўнасці малышоў трэба проста перажыць, перачакаць. Затым самі сабой узнікаюць эфекты самаарганізацыі і ўпарадкаванасці. Менавіта гэта ў хуткім часе і адбылося (асабліва стала прыкметным на наступны дзень). Аднак напярэдадні была яшчэ ноч, калі я павінен быў рашыць — што ж рабіць далей? "А можа не прыдуць?" — маладушна думаў я.

Раніцай прыйшлі ўсе і нават яшчэ больш. Але іх я ўжо не баяўся. За ноч мне ўдалося пярвічна структураваць дзіцячыя імкненні і выявіць гэтыя патрэбы ў мове дзеяння.

І вось мы ствараем групу следапытаў для даследавання анамальных зон на тэрыторыі лагера, другую групу пасылаем шукаць Самыя Пэўныя Свед-

чанні гаспадарання нячыстай сілы, трэцяя малюе карту-схему незвычайных з'яў, чацвёртая апытвае сведак, якія сутыкаліся з чым-небудзь незвычайным, і запісвае ўсё ў спецыяльныя сшыткі па прыдуманай намі тут жа форме. Пятая распрацоўвае праект пасведчання "паляўнічых", шостая будуе з саломы і галінак велізарнага бутафорскага чорта, у якога па агульнапрынятай версіі ўселіцца бесцялесная, але раз'юшаная нечысць. У кожнай групе — свае лідэры і даволі нядрэнная дысцыпліна.

Вось і вечар. На дзевяць гадзін намечана рытуальнае спаленне чорта, закліканае пазбавіць наш лагер ад нячыстай сілы. Ужо а палове дзевятай усе дзеці на месцы збору. Мы спяваем развучаную днём песню "паляўнічых за прывідамі", абменьваемся ўражаннямі дня, разглядаем і ўдакладняем карту анамальных з'яў, сартуем беражліва сабраныя дзецьмі дзіўныя прадметы. Іх аказалася неверагоднае мноства, можна музей адкрываць. Тут і аранжавая поўсць, і жалезка з адбіткам кіпцюрастай лапы, і лядзяш, знойдзены пад дахам спальнага корпуса (гэта ў 30-градусную спёку!). Словам, многа-многа рознай усячыны, можа ў іншых умовах і звычайнай, але ў нашай сітуацыі значнай, сімвалічнай.

Роўна ў дзевяць над кастровай пляцоўкай паўстае велізарны слуп чорна-жоўтага дыму. У яго абрысах нехта паспеў заўважыць прыкметы чортавага аблічча. Натоўп "паляўнічых" шалее і трыумфуе. Мы малайцы, мы выратавалі лагер ад такога страшнага няшчасця! Хуценька складзеная дэлегацыя ўжо збіраецца аднесці ў падарунак начальніку лагера карту анамальных з'яў, як раптам раздаецца жаночы крык, што перакрывае нават гул "паляўнічых":

— Вы, вы дарослы чалавек! Вы вучоны! Як вы можаце! Гэта ж цемрашальства! Вы марочыце дзецям галовы! — праз дзіцячы натоўп прабіраецца ў мой бок перапоўненая абурэннем адна з важатых нашага лагера. Згубіўшы надзею прабрацца да мяне, яна крычыць дзецям:

— Няма, няма ніякага чорта, няма нячыстай сілы! Гэта ж лухта!

— Ёсць! Ёсць! — адказвае ёй хор "паляўнічых". — Вось доказы.

З усіх бакоў да яе цягнуцца дзіцячыя рукі з каменьчыкамі і пер'ямі, паперкамі і рознакаляровымі пікельцамі.

— Але ж усё гэта — смецце, — яшчэ спрабуе пераканаць малышоў важатая, але яе ўжо ніхто не слухае, паколькі ўвага ўсіх раптам пераключаецца ў бок кастра, дзе адбываецца нешта не зусім звычайнае. Велізарны, абгарэлы знізу касцяк нашага чорта нейкім цудам яшчэ трымаецца на асмаленым драўляным штыры таўшчынёй не больш за дзіцячы мезенец. Вось гэта цуд, дык цуд!

Так закончыўся наш вечар. Дадам толькі, што гэтая і наступныя ночы прайшлі абсалютна спакойна. Страх знік, істэрыкі не паўтараліся. Можа, такі ход падзей і не звязаны з нашым "палyваннем". Але нават калі гэта і так, то ўсё ж тое, што адбылося, мае важны як педагагічны, так і псіхалагічны сэнс для ўсіх яго ўдзельнікаў — як дзяцей, так і дарослых.

Перш за ўсё нашы выхаванцы набылі вопыт работы з адным са складана ўсведамляемых зместаў псіхічнага жыцця чалавека — містычнымі з'явамі. Яшчэ зусім нядаўна (у гістарычнай рэтраспектыве) разнастайныя ірацыянальныя феномены афармляліся асаблівымі культурнымі сродкамі, выпрацаванымі ў міфалогіі і рэлігіі. Але сёння міф развенчаны, рэлігія ў заняпадзе, а чалавек, асабліва дзіця, аказаўся безабаронным і бяссільным перад уласным вар'яцтвам. Калі дарослы, да таго ж дастаткова адукаваны чалавек, здольны саўладаць з містычным пачуццём, перажываннем, то дзіцяці гэта проста не па сілах. Ні высокая адвольнасць, ні неабходныя для такой работы тэарэтычныя абстракцыі ў яго яшчэ не выпрацаваліся, а значыць, зробленыя намі разам крокі дазволілі малышам сфарміраваць уменне хаця б пярвічна вырашаць важныя жыццёвыя праблемы.

З логіка-псіхалагічнага пункту гледжання ў нашым сумесным руху можна выдзеліць некалькі этапаў:

1. Непасрэднае перажыванне страху.

2. Сімвалізацыя вопыту ў сістэме індывідуальных значэнняў.

3. Пераазначванне індывідуальных зместаў ва ўзгодненых знакавых формах.

4. Рытуальнае практычнае дзеянне, якое рэалізуе аформленыя такім чынам у свядомасці адносіны.

(Схема аналізу прапанавана А. М. Гусакоўскім.)

У педагагічным плане цікавай мне здаецца спроба выхавальніка ажыццяўляць рух ад дзіцяці, яго жыццёвых праблем, а не ад сацыяльных задач і мэт. Педагог толькі арганізоўвае прастору для дзіцячай актыўнасці, але не навязвае і не задае яе форм і зместаў. У паводзінах дзяцей выразна выяўляюцца ўсе прыкметы ініцыятывы і самаарганізацыі, творчай кааперацыі і прадуктыўнага дзеяння. Задача выхавальніка — дапама-

гчы выявіць, аформіць, структурыраваць пазіцыю дзяцей.

Тут узнікае цікавае пытанне. Можа, дзеці і самі справіліся б з праблемамі, што ў іх узніклі, можа, педагог у гэтым масавым дзеянні наогул не патрэбен?

Мне здаецца, што ўдзел педагога (дарослага) у апісанай падзеі быў рашаючым. Папершае, выхавальнік "трымаў" сітуацыю. Дзеці імпульсіўныя і непастаянныя. На працягу дня ў іх знікае і ўзнікае вялікае мноства гульнявых прастораў. Змена роляў, гульнявых і жыццёвых сюжэтаў — натуральны стан малышоў. Няма нічога горшага за педагагічную заарганізаванасць дзіцячых зносін, калі прымяншаюцца роля і значэнне стыхійных гульняў выхаванцаў. Аднак стыхійныя гульні зусім не выключаюць удзел у іх педагога, проста яго прысутнасць становіцца ў гэтых падзеях дастаткова спецыфічнай.

Так, у нашым выпадку выхавальнік, заняўшы гульнявую пазіцыю, абазначыў тое месца, у якім магла канцэнтравацца дзіцячая актыўнасць, а маркіроўка гэтага месца знакам "паляўнічых" вызначыла сэнсавы кантэкст масавай творчасці. Акрамя таго, выкінуты на гэтую пляцоўку эмацыянальна-афектыўны змест, як вы ўжо, напэўна, паспелі заўважыць, вызначаўся адсутнасцю пэўнай структуры. У пандэміі страху выяўлялі сябе самыя разнастайныя несвядомыя і малаўсвядомленыя імпульсы. Хаатычна ўзаемадзейнічаючы адзін з адным, узаемаіндуцыруючы і ўзаемаразбураючы, гэтыя эмацыянальныя зместы без дапамогі педагога слаба паддаваліся ўсведамленню, а значыць, і непадзельна ўладарылі ў галовах дзяцей. Дзеянне выхавальніка разгортваецца ў зоне бліжэйшага развіцця дзіцяці. Самому малышу пакуль не справіцца са сваім унутраным светам, таму мы дзейнічаем разам.

І, нарэшце, ва ўзгадненні дзіцячых інтарэсаў праяўляецца яшчэ адна тэндэнцыя педагагічнага ўдзелу. Справа ў тым, што структуры, якія самаарганізуюцца, — эгацэнтрычныя і ў момант свайго станаўлення апазнаюць сябе, як правіла, праз супрацьпастаўленне іншым. У выніку павышаецца канфліктнасць і агрэсіўнасць удзельнікаў ствараемага згуртавання. Унутрыгрупавая каардынацыя і забеспячэнне знешніх кантактаў — важны напрамак работы выхавальніка.

Вось такая гісторыя адбылася ў летнім дзіцячым лагеры. Гульня ў "паляўнічых за прывідамі", а зрэшты, для дзяцей яна не была гульнёй, вельмі сур'ёзна падарвала мой давер да прынцыпу навуковасці і важнасці навуковага светапогляду для нашых дзяцей. Усяму свой час. Калі-небудзь яны будуць жыць у іншым вымярэнні, нашым, дарослым. У іх свядомасці паселяцца законы сусвету і апраўданы вопытам скепсіс. Пакуль жа няхай будуць казка, міф, якія дапамагаюць нам жыць.

А як жа прынцыпы?

Цяпер я, здаецца, пачаў разумець фразу, кінутую некалі ў бурнай педагагічнай дыскусіі маскоўскім вучоным Галінай Пахмелкінай: "Я — за беспрынцыповасць, калі прынцыпы перашкаджаюць мне жыць".

Настаў час пераглядаць прынцыпы.

**А. А. ПАЛОННІКАЎ,**
**педагог.**

# Баяцца ці не баяцца?



Традыцыйна лічыцца, што чалавек баіцца невядомага. У сучаснай культуры пануе перакананне, што баяцца дрэнна і трэба зрабіць усё неабходнае, каб чалавек навучыўся перамагаць падобнае пачуццё. Адзначым адразу, што мы не зусім падзяляем гэтае перакананне. Прывядзём некалькі меркаванняў на "карысць" страху. Агаворымся, што мы не абмяркоўваем тут клінічных фабій, якія ўзнікаюць на аснове парушэння нармальнага функцыяніравання псіхікі.

Баяцца для чалавека, на нашу думку, гэтак жа натуральна, як дыхаць. Страх — адзін з магутных інстынктаў, якім прырода надзяліла чалавека. Аднак нешта супраціўляецца ў нас, калі мы спрабуем адназначна рэабілітаваць страх. Розум паслужліва прапаноўвае прыклады, калі чалавек здзяйсняе ўчынак, мужна пераадольваючы страх. Каб разабрацца ў гэтым, паспрабуем аддзяліць страх біялагічны ад душэўнага, пачуццё ад эмоцыі.

Наш уласны вопыт сведчыць: выпадкаў, калі страх кіруе намі ў жыцці, значна больш, чым выпадкаў яго пераадолення. Спачатку мы баімся цемры, застацца адны ў